**19.** Аленка задумалася, ці мае яшчэ якую назву кветка ***васілёк***. Неўзабаве ўспомніла, што на Беларусі гэту кветку яшчэ называюць ...

**А)** вайда; **Б)** валавока; **В)** валошка;
**Г)** бутэрлак; **Д)** астра.

**20.** Народная прыказка ***«сем разоў адмерай – адзін раз ...»*** заканчваецца дзеясловам:

**А)** перамерай; **Б)** не глядзі; **В)** адрэж;
**Г)** пераглядзі; **Д)** недарэж.

**21.** Вучні паспрачаліся наконт роду назоўніка ***абцугі***. Алесь сказаў, што гэта слова – мужчынскага роду, Міхась – жаночага роду, Янка – ніякага роду, Алена – агульнага роду, Сымон – род нельга вызначыць. Хто сказаў правільна?

**А)** Алесь; **Б)** Міхась; **В)** Янка; **Г)** Алена; **Д)** Сымон.

**22.** Якія назоўнікі з прыведзеных не ўжываюцца ў множным ліку?

1) *малако*; 2) *поўдзень*; 3) *сад*;
4) *Нарач*; 5) *ложак*; 6) *брат*.

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 2, 6; **В)** 2, 3, 4; **Г)** 2, 4, 5; **Д)** 3, 4, 6.

**23.** Што абазначае імя ***Галіна*** ў перакладзе з грэчаскай мовы на беларускую мову?

**А)** квітнеючая; **Б)** грацыя, мілавіднасць;
**В)** спакой, ціхамірнасць; **Г)** прыхільнасць, зычлівасць;
**Д)** чайка.

**24.** Пры раскопках старажытных усходнеславянскіх гарадоў вучоныя знаходзяць берасцяныя граматы. Як называлася прылада, якой у старажытнасці надрапвалі літары на бяросце?

**А)** пяро; **Б)** зубіла; **В)** пісала; **Г)** кувалда; **Д)** крэйда.

---

Конкурс арганізаваны і праводзіцца Грамадскім аб'яднаннем «Беларуская асацыяцыя «Конкурс» сумесна з Акадэміяй паслядыпломнай адукацыі пад эгідай Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь.

*220013, г. Мінск, вул. Дарашэвіча, 3, РЗШ АПА («Буслік»).*
*тэл. (017) 232 80 31, 292 34 01; e-mail: kenguru_belarus@mail.ru*
*http://bak.academy.edu.by/*

ГА «Беларуская асацыяцыя «Конкурс». Заказ 1. Тыраж 13500 экз.

Конкурс па беларускай мове
**«БУСЛІК-2006»**

*Чацвер, 26 студзеня 2006 года*

Заданне для вучняў 3-4 класаў

- працягласць работы над заданнем 1 гадзіна 15 хвілін;
- карыстацца падручнікамі, канспектамі, справачнай літаратурай забараняецца;
- кожны правільны адказ адзначаецца трыма, чатырма ці пяццю баламі; колькасць балаў, якія атрымлівае ўдзельнік, адказваючы на пытанне правільна, вызначаецца складанасцю пытання; складанасць пытання вызначаецца па колькасці ўдзельнікаў, якія правільна адказалі на пытанне;
- няправільны адказ адзначаецца чвэрцю балаў, прадугледжаных за дадзенае пытанне, і залічваецца са знакам «мінус», у той час, як не даўшы адказу, удзельнік захоўвае раней набраныя балы;
- на кожнае пытанне маецца толькі адзін правільны адказ;
- самастойная і сумленная работа над заданнем – галоўнае патрабаванне арганізатараў да ўдзельнікаў конкурсу;
- на старце ўдзельнік атрымлівае авансам 30 балаў;
- максімальная колькасць балаў, якую можа атрымаць удзельнік конкурсу, – 150;
- пасля заканчэння конкурсу лісток з заданнем застаецца ўдзельніку.

---

**1.** Якая літара пачынае беларускі алфавіт?

**А)** я; **Б)** а; **В)** о; **Г)** у; **Д)** э.

**2.** Выберыце з дадзеных гук, які не з'яўляецца галосным.

**А)** [а]; **Б)** [о]; **В)** [у]; **Г)** [ы]; **Д)** [й].

**3.** У рускай мове ўжываецца цвёрды раздзяляльны знак. Што замяняе яго ў беларускай мове?

**А)** ь; **Б)** няма замены; **В)** (') апостраф; **Г)** ў; **Д)** й.

**4.** Дадзены словы:

1) *агонь*; 2) *кап'ё*; 3) *дзіва*; 4) *сама*; 5) *дзьме*; 6) *дзед*.

Якія з іх маюць чатыры літары?

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 1, 3, 6; **В)** 2, 3, 5; **Г)** 2, 4, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**5.** Колькі цвёрдых зычных гукаў у сказе?

**Ціха стаіць заснежаны лес.**

**А)** 4; **Б)** 6; **В)** 7; **Г)** 8; **Д)** 12.

**6.** Якія словы з прыведзеных нельга падзяліць для пераносу?

1) *сям'я*; 2) *гульня*; 3) *урок*;
4) *просьба*; 5) *дождж*; 6) *пад'ём*.

**А)** 1, 3, 5; **Б)** 1, 4, 6; **В)** 2, 3, 5; **Г)** 2, 5, 6; **Д)** 3, 4, 5.

**7.** Якой агульнай літары не хапае ў словах ***салаве...***, ***кра...***, ***вуле...***, ***соне...ка***, ***ро...***?

**А)** ю; **Б)** я; **В)** і; **Г)** й; **Д)** ў.

**8.** Колькі слоў у форме назоўнага склону можна скласці, ужыўшы тры літары ***а***, ***м***, ***я***?

**А)** 0; **Б)** 1; **В)** 2; **Г)** 3; **Д)** 4.

**9.** Вызначце толькі звонкія зычныя гукі.

1) [ф]; 2) [к]; 3) [л]; 4) [н];
5) [ц]; 6) [з]; 7) [с]; 8) [ш].

**А)** 1, 3, 7; **Б)** 1, 4, 8; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 3, 4, 6; **Д)** 3, 5, 7.

**10.** Дапоўніце радок верша А. Вольскага.

*Той, хто быць пісьменным хоча,*
*Знаць павінен з першых год*
*Род мужчынскі,*
*Род жаночы і яшчэ – ...*

**А)** свой род; **Б)** ніякі род; **В)** чужы род;
**Г)** гукі і літары; **Д)** умець чытаць.

**11.** Вучань запісаў на дошцы сказ: ***У дуплах дрэў жывуць восы, краты, дзятлы, вавёркі, совы.*** Настаўнік сказаў, што не ўсе істоты з напісаных могуць жыць у дуплах дрэў. Хто гэта?

**А)** восы; **Б)** краты; **В)** дзятлы;
**Г)** вавёркі; **Д)** совы.

**12.** Колькі дзеясловаў ужыта ў вершы У. Карызны?

*Сонейка прыгрэла –*
*Аж павесялела.*
*Ля акна бярозка*
*Уся зазелянела.*
*Пасінела неба,*
*Рэчка пасвятлела.*
*Матылькі ўзняліся*
*Каля вішань смела.*

**А)** няма дзеясловаў; **Б)** 3; **В)** 5; **Г)** 6; **Д)** 8.

**13.** Колькі словазлучэнняў можна выдзеліць у сказе?

**Першыя зоркі таямніча замігацелі ў небе.**

**А)** 1; **Б)** 2; **В)** 3; **Г)** 4; **Д)** 5.

**14.** У якіх словах літара ***і*** мае два гукі?

1) *заінеў*; 2) *салаўі*; 3) *ціішыня*;
4) *героі*; 5) *нітка*; 6) *свеціць*.

**А)** 1, 2, 4; **Б)** 1, 3, 4; **В)** 1, 4, 5; **Г)** 2, 3, 5; **Д)** 2, 4, 6.

**15.** Сымонка не мог успомніць, як называецца чалавек, які ўмее і любіць збіраць грыбы. Аленка сказала яму, што гэта ...

**А)** герой; **Б)** батанік; **В)** паляўнічы;
**Г)** грыбнік; **Д)** повар.

**16.** Вызначце, якія словы напісаны правільна.

1) *цень*; 2) *дзяцька*; 3) *туман*;
4) *темра*; 5) *здароў'е*; 6) *разьбяр*.

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 1, 3, 6; **В)** 2, 3, 4; **Г)** 2, 4, 5; **Д)** 3, 5, 6.

**17.** Выберыце словы, якія абазначаюць назвы дрэў:

1) *сом*; 2) *ясень*; 3) *ліпа*;
4) *рамонак*; 5) *чапля*; 6) *асіна*.

**А)** 1, 2, 5; **Б)** 2, 3, 6; **В)** 2, 4, 5; **Г)** 3, 4, 6; **Д)** 3, 5, 6.

**18.** Якому слову адпавядае лексічнае значэнне «*мелкае месца, дзе пераходзяць раку*»?

**А)** багаж; **Б)** буран; **В)** брод; **Г)** плынь; **Д)** вір.